УДК 336.74:39

# ГРАШОВАЯ ТЭМАТЫКА Ў РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

***І. Н. Колабава,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжана роля грошай у радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларусаў. Крыніцазнаўчай базай даследавання сталі фальклорныя зборнікі беларускіх аўтараў XIX – пачатку XX ст., у якіх зафіксаваны алгарытмы правядзення сямейных рытуалаў, звязаных з нараджэннем і хрэсьбінамі дзіцяці. Прыведзены найбольш каларытныя прыклады выкарыстання грошай у беларускай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці.

**Ключавыя словы:** радзінна-хрэсьбінная абраднасць, прыкметы і павер'і, грашовая тэрміналогія, грошы як феномен культуры.

# MONEY ISSUES IN THE BIRTH AND CHRISTENING CEREMONY OF THE BELARUSIANS

***I. Kolabava,*** *PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the role of money in the birth and christening ceremony of the Belarusians. The source base of the research became folklore collections of Belarusian authors of the 19th – the beginning of the 20th century, in which the algorithms for conducting family rituals related to the birth and christening of a child are recorded. The text of the article gives the most colorful examples of the use of money in the Belarusian birth and christening ceremony.

**Keywords:** birth and christening ceremony, signs and beliefs, monetary terminology, «money» as a cultural phenomenon.

Радзінна-хрэсьбінная абраднасць як элемент духоўнай спадчыны беларусаў уяўляе сабой шматгранны структурны комплекс, які складаецца з шэрагу магічных маніпуляцый, адпаведнага набору прадметнай абрадавай атрыбутыкі і фальклорных элементаў (прыкметаў, павер'яў, звычаяў, прыказак і прымавак, тлумачэнняў сноў, рытуальных песень і інш.).

Радзінна-хрэсьбінная абраднасць ахоплівала шырокае кола праблем, звязаных з перыядам цяжарнасці жанчыны, дапамогай парадзіхе ад бабкі-павітухі, вырашэннем пытання выбару кума і кумы, рытуалам правядзення першага купання дзіцяці, абрадам хрышчэння, хрэсьбінным застоллем з разбіваннем гаршчка з бабінай кашай, ушанаваннем гасцямі павітухі і парадзіхі, узаемным адорваннем прысутных традыцыйнымі падарункамі і сумесным спяваннем абрадавых песен.

Усе гэтыя шматлікія мерапрыемствы мелі лагічную, правераную часам паслядоўнасць і праводзіліся з мэтай уключэння дзяцяці ў сацыяльнае асяроддзе. Людзі былі ўпэўнены, што правільнае і поўнае выкананне адпаведных абрадаў будзе станоўча ўплываць на далейшы лёс, здароўе, знешні выгляд, матэрыяльнае становішча нованароджанага чалавека. Пры ўяўнай у цэлым аднолькавасці радзіннахрэсьбінных рытуалаў кожная мясцовасць уносіла ў іх свае непаўторныя рэгіянальныя асаблівасці.

У канцы XIX – пачатку XX ст. намаганнямі даследчыкаў беларускага фальклору была сфарміравана грунтоўная база фактычнага матэрыялу, які склаў крыніцазнаўчую аснову для вывучэння беларускай народнай культуры ў далейшыя перыяды. Падрабязнае апісанне ўсіх акалічнасцей традыцыйнай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларусаў можна знайсці ў фальклорных зборніках М. Я. Нікіфароўскага (1845–1910), Е. Р. Раманава (1855–1922) А. К. Сержпутоўскага (1864–1940) – менавіта ў іх зафіксаваны актыўны ўдзел грошай у разглядаемых абрадных мерапрыемствах.

Існаванне шырокага поля дзейнасці грошай ў эканамічнай і фінансавай сферах паступова прывяло да значнага пашырэння іх уплыву на духоўнае жыццё чалавека і грамадства ўвогуле. Грошы – прыклад філасофскага ўвасаблення адзінства дабра і зла, і менавіта на гэта рабіўся ўпор у творах народнага беларускага фальклору. Адыгрываючы адну з ключавых роляў у фарміраванні светапогляду чалавека, грошы становяцца рэгулятарам і своеасаблівым гарантам захаванасці норм грамадскіх інтарэсаў. З'яўляючыся традыцыйным кампанентам радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, грошы актыўна адыгрывалі камунікатыўную ролю як унутры грамадства, так і паміж чалавекам і звышнатуральнымі сіламі.

У зборніку М. Нікіфароўскага «Простонародные приметы и поверья...» зафіксавана павер'е пра тое, што для будучага заможнага жыцця дзіцяці

яго бацька пры першым купанні павінен кінуць у ночву (карыта) некалькі срэбных манет. Для таго, каб дзіця ў дарослым жыцці не забірала чужое, бабка перакладала гэтыя грошы ў сваю кішэню толькі пасля таго, як акуратна злівала брудную ваду ў яму, дзе знаходзілася «дзяцячае месца» [1, с. 14].

Падобны алгарытм дзеянняў апісваецца і Е. Раманавым у «Беларускім зборніку». У Шчарбінскай воласці Віцебскага павета пры першым купанні дзіцяці бацька кідаў у ваду срэбныя грошы каб дзіця было багатым і чыстым, як срэбра. Пасля купання дзіця перадавалі маці, а грошы забірала бабка-павітуха [2, с. 329].

Калі дзіця часта хварэла, бацькі праводзілі рытуал продажу дзяцяці нейкай даверанай асобе (купцу). У выніку перамоў яны атрымлівалі ад купца некалькі капеек і запівалі завершаную справу гарэлкай. Дзіця заставалася з бацькамі, але фармальна лічылася чужым таварам на часовым утрыманні. У выпадках хваробы дзіцяці бацькі пачыналі лаяць купца за дрэнны тавар, а купец лаяў бацькоў за дрэннае захаванне яго тавару. У выніку пад ціскам лаянкі хвароба ад дзіцяці павінна была сыйсці [1, с. 16–17].

Падобнае павер'е зафіксавана і ў Е. Раманава, калі па дамоўленасці «купец» выплачваў за дзіця пяць капеек, якія ўкладаліся ў дзіцячую люльку, а потым перадаваліся ў царкву [2, с. 304].

Для зоркасці маці працірала вочы дзіцяці срэбрам [1, с. 23]. А калі дзіця «накрычала пуп», то трэба на гэта месца прывязаць дня на тры знойдзены ці дадзены старцам медны пятак ці адпаведную медную манету [Там жа, с. 43].

У фальклорным зборніку А. Сержпутоўскага «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» паведамляецца, што калі родзіцца дзіця, то для шчасця яго заварочваюць у сарочку: калі дзяўчынка, у бацькоўскую, а калі хлопчык – матчыну. У воду кідалі грошы і жуковіну каб дзіця было багатае і шчаслівае ў пары. Тую ваду пасля дзяўчынкі вылівалі за парог, а пасля хлопчыка – пад печ каб ён быў добрым гаспадаром [3, с. 172]. Калі ж дзіця падрасце, яму прапанавалі тры рэчы – грошы, розгу і кніжку: калі схопіцца за грошы – будзе багатым, за розгу – паслухмяным, за кніжку – разумным [Там жа, с. 175].

Е. Раманаў у «Беларускім зборніку» прыводзіць падрабязнае апісанне хрэсьбіннага застолля з разбіваннем гаршчка з бабінай кашай. Так, у в. Аслянка Мсціслаўскага павета гаршчок з грэчневай кашай бабка дае куму, той бярэ тры лыжкі кашы і кладзе на талерку. Туды ж ставіцца і чарка з гарэлкай. Усё гэта кум, дадаўшы на талерку колькі-небудзь грошай срэбнай манетай, падае парадзіхе, якая ў сваю чаргу адорвае яго куском палатна. Кум нібыта выпадкова выпускае і разбівае гаршчок, а на чарапкі павівальная бабка кладзе кавалкі густа зваранай кашы і разам з гарэлкай падносіць прысутным, прыгаворваючы: «Нат-ка...

бабінай кашы! Паглядзім на рублікі вашы! Гарэлачку выпі, кашай заясі, талерачку пазалаці». Запрошаны бярэ кашу, выпівае гарэлку і кладзе на чарапок некалькі манет [2, с. 327].

Другі варыянт правядзення абрада бабінай кашы апісаны у в. Гарадзец Быхаўскага павета. Хрышчэнне дзіцяці, як правіла, у большасці выпадкаў адбывалася ў самы дзень нараджэння ці не пазней другога дня. На хрысьцінах апошнім блюдам на стол ставілася бабіна каша, у вялікім гаршчку і накрытая хлебам. Павітуха прасіла ў гасцей «унуку на мыла». Кум некалькімі ўдарамі аб стол разбіваў гаршчок, і на чарапкі накладалася каша. Госці бралі кашу, а замест яе клалі грошы, якія разам з хлебам бабка перадавала парадзіхе. Атрымaную бабіну кашу госці заварочвалі ў хустку, паперу ці рушнік і неслі дахаты дзецям як пачастунак [2, с. 328].

Яшчэ адзін варыянт гэтага свята зафіксаваны Е. Раманавым у Шчарбінскай воласці Віцебскага павета. У канцы хрэсьбіннага абеду павівальная бабка падавала на стол сваю кашу, упрыгожаную ці блінамі, ці мясам, ці абаранкамі, ці цукеркамі. Спяваючы рытуальную песню, яна абносіла ўсіх гасцей кашай, а тыя давалі ёй грошы [2, с. 330].

Лакальная інтэрпрытацыя святкавання хрэсьбінаў была і ў в. Забалоцце Рагачоўскага павета. Запрошаныя на хрэсьбіны прыносілі свае пачастункі: жанчыны – хлеб па кавалку (фунты тры), чверку ці куска сала (з паўфунта), ці крупы (грэчневую, ячную), ці зерня (проса, канаплі); мужчыны – адну-дзве капейкі кожны.

У канцы рытуальнага частавання бабка казала, каб падалі яе кашу, якую яна зварыла дома з грэчкі з салам ці з проса. Гаршчок па аб'ёму быў з палову вядра. Пры гэтым бабка закрывала кашу талеркай і прасіла пакласць на яе па чырвонцу. Госці клалі на талерку па 2–4 манеты і гучна абвяшчалі прысутных, што яны ўкінулі свае чырвонцы. Прычым у незаможных вясковых сем'ях сабраная з гасцей сума вагалася ў межах грывенніка (10 капеек), а ў сем'ях заможных вяскоўцаў магла дасягаць і палцінніка (50 капеек).

Сабраныя грошы адносілі парадзіхе, якая знаходзілася з дзіцём за палогам. Затым кум з трэццяга разу разбіваў гаршчок і на яго чарапках раздавалі кашу гасцям. У канцы свята кум клаў для кумы на талерку пірог, рубель і выпіваў за яе здароўе. На другі дзень адбываліся пахрысціны, на якія запрашалі толькі кума, куму, сваякоў і павітуху, якую адорвалі грывеннікам [2, с. 332–334].

У Любавіцкай воласці Мсціслаўскага павета бабка выкладала на чарапкі кашу і кавалкі мяса, а ў посныя дні – рыбу, селядзец, і з чаркай гарэлкі падносіла гасцям. Пры гэтым яна прасіла: «Кашу з гарэлачкай прыміця, а мне руку пазалаціця». Госці выпівалі гарэлку і давалі ёй па некалькі капеек. Па завяршэнні святкавання парадзіха адорвала бабку

і кума халстом. Кум жа даваў ёй несколько манет, прыгаворваючы: «Кума куму халсціну, а кум куме палціну!» [2, с. 335].

Прыведзеныя матэрыялы сведчаць аб варыятыўным выкарыстанні грошай падчас радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. У большасці выпадкаў фіксуюцца абагульняльныя грашовыя тэрміны – грошы, срэбра, срэбныя грошы, а таксама больш канкрэтызаваныя паняцці – срэбная манета; зрэдку сустракаюцца і дакладныя грашовыя сумы – капейкі, 1 капейка, 2 капейкі, 5 капеек, медны пятак, грыўня, палціннік, рубель, чырвонец. У выніку неабходна адзначыць, што сучасны ўзровень вывучэння феномена «грошы» дае магчымасць вызначаць грошы і як феномен культуры.


1. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. Типо-Литография, 1897. – 307 с., 26 с. примеч.

2. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8–9 : Быт белоруса. Словарь условных языков. – 724 с.

3. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.